КОНТРОЛЬНЫЙ ЭКЗЕМПЛЯР

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ МАКСІМА ТАНКА»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар
________________ А.І.Жук
« 17 » 04 2024 г.
Рэгістрацыйны № УД-174/2024/вуч.

**ЛІТАРАТУРАЗНАЎЧАЕ КРАІНАЗНАЎСТВА**

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці**
**1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура**

2024 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове Адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі АСВА 1-02 03 01-2021 (20.04.2022, №85), вучэбнага плану спецыяльнасці 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура (15.07.2021, №048 – 2021/у; 23.06.2022, №133 – 2022/у)

**СКЛАДАЛЬНІК:**
Т.П.Хоміч, дацэнт кафедры беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат філалагічных навук

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
А.С.Гурская, дацэнт кафедры міжкультурнай камунікацыі ўстановы адукацыі «Інстытут сучасных ведаў імя А.М. Шырокага», кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
В.В.Урбан, дацэнт кафедры моваведаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**УЗГОДНЕНА:**
Дырэктар
ДУА «Гімназія № 43 г. Мінска» М.Ф.Каваноўская

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
Кафедрай беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 8 от 25.03.2024 г.)

Загадчык кафедры ____________ І.М.Мішчанчук

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 6 ад 16.04. 2024 г.)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючых яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст вучэбна-метадычнага аддзела БДПУ ____________ Я.В.Ціханава

Дырэктар бібліятэкі ____________ Н.П.Сяткоўская

Сканировано с CamScanner

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Літаратуразнаўчае краіназнаўства» распрацавана для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі Адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі АСВА 1-02 03 01 – 2021 для спецыяльнасці 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура.

Мастацкае слова заўсёды трывае гістарычную, духоўную і матэрыяльную сувязь з пэўнай краінай. Нацыянальная літаратура – гэта своеасаблівае люстэрка жыцця і працы, гаспадарчай дзейнасці, грамадскага і культурнага развіцця народа, адлюстраванне яго жыццёвага вопыту, самапазнання і светаўспрымання, асаблівасцей мыслення і псіхікі, маральна-этычных і эстэтычных нормаў. Літаратура дапамагае зведаць краіну, а краіна, яе нацыянальна-культурны код, спрыяе, у сваю чаргу, пазнанню літаратуры і тых, хто стварае яе – пісьменнікаў.

Прадметам вучэбнай дысцыпліны «Літаратуразнаўчае краіназнаўства», якая з’яўляецца дапаможнай у сістэме літаратуразнаўчых дысцыплін, выступаюць дыялектычныя ўзаемасувязі беларускай літаратуры з духоўнай і матэрыяльнай прасторай (тэрыторыяй) пэўнага рэгіёна і краіны ў цэлым.

***Мэта*** вучэбнай дысцыпліны – фарміраванне і пашырэнне ведаў пра беларускі літаратурны працэс у краіназнаўчых аспектах (з улікам нацыянальна-гістарычных асаблівасцей культуры рэгіёнаў і краіны ў цэлым).

***Задачы вучэбнай дысцыпліны:***

– даць студэнтам веды ў галіне гісторыі літаратуразнаўчага краіназнаўства і краязнаўства ў Беларусі;

– сфарміраваць разуменне перспетыўнасці краіназнаўчых ведаў у асэнсаванні літаратурных з’яў і літаратурнага працэсу;

– прадставіць навукова-абгрунтаваны падыход да рэгіянальнага прынцыпу ў літаратуразнаўчым аналізе мастацкага твора і вывучэнні літаратуры ў цэлым;

– навучыць арыентавацца ў свеце беларускай літаратуры ў суадносінах з культурна-гістарычнай сітуацыяй, рэгіянальным фактарам;

– пазнаёміць будучых настаўнікаў-славеснікаў з педагагічнымі і выхаваўчымі магчымасцямі літаратурна-краязнаўчай працы;

– выпрацаваць асобныя навыкі практычнай дзейнасці ў галіне літаратурнага краязнаўства.

**Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста, сувязі з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі.**

Згодна з вучэбнымі планамі па спецыяльнасці 1–02 03 01 «Беларуская мова і літаратура» вучэбная дысцыпліна «Літаратуразнаўчае краіназнаўства» ўваходзіць у кампанент установы вышэйшай адукацыі і з’яўляецца часткай модуля «Дапаможныя аспекты літаратуразнаўства», узаемадзейнічае з дысцыплінай «Літаратуразнаўчы аналіз мастацкага тэксту», дапаўняе і

паглыбляе ўменні і навыкі атрыманыя ў межах вучэбных дысцыплін «Уводзіны ў літаратуразнаўства», «Вусная народная творчасць», а таксама дысцыплін модулей «Гісторыя беларускай літаратуры», якія ўваходзяць у дзяржаўны кампанент.

**Патрабаванні да засваення вучэбнай дысцыпліны.**

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Літаратуразнаўчае краіназнаўства» павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў спецыялізаванай кампетэнцыі СК-11: Аналізаваць мастацкі твор у суадносінах з культурна-гістарычнымі ўмовамі яго стварэння.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен ***ведаць:***

– гісторыю і сучасны стан літаратурнага краіназнаўства і краязнаўства ў Беларусі;

– сутнасць і асновы рэгіянальнага прынцыпу ў літаратуразнаўчым аналізе;

– рэгіянальныя асаблівасці ў творах беларускіх пісьменнікаў-класікаў і пісьменнікаў-землякоў;

– віды літаратурна-краіна- і краязнаўчых выданняў;

– асноўныя літаратурныя музеі Беларусі і рэгіёна, дакументальны і прадметны матэрыял музея асобнай мясцовасці;

– галоўныя культурна-асветніцкія цэнтры Беларусі і рэгіёна, іх функцыі і ролю ў арганізацыі і правядзенні краязнаўчых мерапрыемстваў;

– агульныя метады і прыёмы вядзення краязнаўчай работы.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен ***умець:***

– ідэнтыфікаваць краіназнаўчыя і краязнаўчыя выданні ў шэрагу літаратуразнаўчых;

– аналізаваць мастацкія творы беларускіх пісьменнікаў у аспекце рэгіянальных традыцый;

– навукова і адэкватна ўспрымаць асаблівасці, значэнне і месца рэгіянальнай літаратуры ў нацыянальным літаратурным працэсе;

– збіраць і сістэматызаваць краязнаўчы матэрыял.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен ***валодаць:***

– навыкамі крытычнага аналізу і інтэрпрэтацыі мастацкага твора;

– адпаведным паняційным і тэрміналагічным апаратам;

– уменнем апрацоўкі сабранага матэрыялу.

У рамках адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне «Літаратуразнаўчае краіназнаўства» студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць свой каштоўнасна-асобасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны.

Па кожнай вучэбнай тэме ў адпаведнасці з яе мэтамі і задачамі па фарміраванні і развіцці ў студэнтаў канкрэтных кампетэнцый выкладчык (кафедра) праектуе і рэалізуе канкрэтныя педагагічныя тэхналогіі.

Асноўнымі тэхналогіямі навучання з’яўляюцца: праблемнае навучанне (праблемнае выкладанне, пошукавы метад, практычная творчасць); камунікатыўныя тэхналогіі, заснаваныя на актыўных формах і метадах навучання (дыскусія, прэзентацыя, работа ў групах); асобасна арыентаваная тэхналогія. Рэкамендаваныя метады і прыёмы навучання: тлумачэнне, эмпірычная гутарка, пошукавая, даследчыцкая дзейнасць, выступленні з дакладамі і паведамленнямі і інш.

**Агульная колькасць гадзін, колькасць аўдыторных гадзін, форма атрымання вышэйшай адукацыі, размеркаванне аўдыторных гадзін, формы прамежкавай атэстацыі.** Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Літаратурнае краязнаўства» на 4 курсе ў 7 семестры разлічана на 96 гадзін. З іх 42 аўдыторныя гадзіны: 20 лекцыйных і 22 гадзіны практычных заняткаў. На самастойную работу студэнтаў адведзена 54 гадзіны. Форма адукацыі – дзённая. Форма прамежкавай атэстацыі – залік.

| Курс | Семестр | Усяго | Лекцыі | Практычныя | Самастойная работа студэнтаў | Форма прамежкавай атэстацыі |
|---|---|---|---|---|---|---|
| IV | VII | 96 | 20 | 22 | 54 | Залік |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## 1. АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ ЛІТАРАТУРАЗНАЎЧАГА КРАІНАЗНАЎСТВА

### *1.1 Сутнасць літаратуразнаўчага краіназнаўства*

1.1.1 Краіназнаўства як навука і вучэбны прадмет. Паняцці краіназнаўства і беларусазнаўства. Аб’ект і прадмет агульнага краіназнаўства. Комплекснае і галіновае (гістарычнае, літаратуразнаўчае, лінгвістычнае, этнаграфічнае, геаграфічнае, прыродазнаўчае) краіназнаўства. Літаратуразнаўчае краіназнаўства як галіна агульнага краіназнаўства. Месца ў сістэме іншых дапаможных дысцыплін літаратуразнаўства. Краіназнаўчы кампанент пры вывучэнні мастацкай літаратуры.

1.1.2 Суадносіны літаратуразнаўчага краіназнаўства і літаратурнага краязнаўства. Напрамкі сучаснага літаратурнага краязнаўства (навуковае, школьнае). Аб’екты літаратурнага краязнаўства. Творчасць пісьменніка як аб’ект літаратурнага краязнаўства. Рэгіянальны кампанент пры вывучэнні літаратуры. Гісторыка-культурныя рэгіёны Беларусі (Цэнтральная Беларусь, Паазер’е, Падняпроўе, Палессе, Панямонне). Паняцце «край». Сучасны адміністрацыйны падзел Рэспублікі Беларусь.

### *1.2 Гісторыя станаўлення і развіцця беларусазнаўства, агульнага і літаратурнага краязнаўства ў Беларусі*

1.2.1 Вытокі краязнаўства. Першыя спробы вывучэння краю ў эпоху Сярэднявечча. Пачатак навуковага асэнсавання значнасці краязнаўчых даследаванняў пад уплывам ідэй Адраджэння. Ф. Скарына аб родным краі. Збіральніцкая дзейнасць Радзівілаў, Сапегаў, Храптовічаў, Агінскіх. Вывучэнне духоўнай і матэрыяльнай культуры асобных мясцовасцей Беларусі Я. Ласіцкім і С. Рысінскім.

Краіназнаўства і краязнаўства ў XIX ст. Першыя краязнаўчыя таварыствы на тэрыторыі Беларусі. Краязнаўчыя і літаратуразнаўчыя нарысы У. Сыракомлі, В. Каратынскага. Уклад Я. Карскага ў развіццё беларусазнаўства. Значэнне дзейнасці газеты “Наша ніва” ў зараджэнні краіназнаўства і краязнаўства. Роля чытанак для школы Цёткі, Якуба Коласа, В. Ластоўскага і Я. Лёсіка ў станаўленні школьнага краязнаўства.

Развіццё краязнаўчай працы ў 1920-я гады. Краязнаўства і палітыка беларусізацыі. Роля Інстытута беларускай культуры ў арганізацыі краязнаўчага руху. 1-я Усебеларуская краязнаўчая канферэнцыя (1924). 1-ы Усебеларускі краязнаўчы з’езд (1926). Роля часопісаў «Наш край» і «Асьвета». Актыўныя арганізатары і ўдзельнікі краязнаўчага руху: Я. Колас, З. Бядуля, М. Гарэцкі, Ц. Гартны, Б. Эпімах-Шыпіла, К. Крапіва, В. Самцэвіч, П. Самцэвіч. Роля М. Касяровіча ў папулярызацыі літаратурнага краязнаўства.

Згортванне краязнаўчай працы ў 1930-я гады, яго прычыны. Лёс знакамітых краязнаўцаў. Развіццё агульнага і літаратурнага краязнаўства ў пасляваенныя гады. Прыняцце закона «Аб умацаванні сувязі школы з жыццём і аб далейшым развіцці народнай адукацыі ў СССР» (1958) і яго роля ў паляпшэнні краязнаўчай працы ў школе.

Агульнае і літаратурнае краязнаўства на сучасным этапе. Першы Рэспубліканскі краязнаўчы форум Беларусі (2020). Пытанні літаратурнага краязнаўства на старонках часопіса «Роднае слова».

1.2.2 Партрэты вучоных-краязнаўцаў: В. Грыцкевіч, М. Ермаловіч, У. Калеснік, І. Казакова, В. Ліцвінка, В. Ляшук, А. Мальдзіс, У. Содаль, А. Фядсоік і інш. Настаўнікі-краязнаўцы.

1.2.3 Літаратурна-краіназнаўчыя выданні. Распаўсюджванне ведаў пра ўзаемадзеянне літаратуры з жыццём пэўнай мясцовасці або Беларусі ў цэлым. Шматтомныя серыі «Беларусь літаратурная», «Жыццё знакамітых людзей Беларусі» і інш. – асаблівасці выданняў. Мастацка-дакументальныя творы пра пісьменнікаў (С. Александровіча, Л. Арабей і інш.). Летапісы жыцця і творчасці беларускіх класікаў, зборнікі пісьменніцкіх аўтабіяграфій («Пяцьдзесят чатыры дарогі» (1963), «Пра час і пра сябе» (1966) і інш.). Літаратурнае краязнаўства ў беларускіх перыядычных выданнях.

***1.3. Літаратурныя музеі як навукова-даследчыя і навукова-метадычныя цэнтры беларусазнаўства і краязнаўства***

Значэнне і функцыі літаратурнага музея. Агляд дзяржаўных літаратурных музеяў на тэрыторыі сучаснай Беларусі (Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы, Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа, Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры). Заснаванне і адкрыццё музеяў, іх калекцыі. Навукова-даследчая праца супрацоўнікаў. Мінскія і раённыя філіялы музеяў (Маладзечанскі, Лагойскі, Сталбцоўскі і інш. р-ны).).

Філіялы, аддзелы, кампазіцыі пры гісторыка-краязнаўчых музеях, прысвечаныя пісьменнікам-землякам. Комплексныя музеі (Цэнтральны дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва Беларусі). Літаратурныя і літаратурна-краязнаўчыя музеі на грамадскіх пачатках.

Школьныя музеі. Збор, улік і захаванне матэрыялаў музея. Экспазіцыя школьнага літаратуразнаўчага музея. Экскурсія ў музеі. Выкарыстанне яго матэрыялаў у вучэбна-выхаваўчай працы школы.

## 2. ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІ ТВОР ЯК КРЫНІЦА НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ІНФАРМАЦЫІ

***2.1 Літаратурны рэгіяналізм як неад’емны кампанент нацыянальнай літаратуры***

Асновы рэгіянальнага прынцыпу вывучэння літаратуры: вывучэнне жыцця і творчасці пісьменніка-земляка; вывучэнне мастацкай спадчыны

пісьменніка-класіка ў рэгіянальным аспекце; даследаванне літаратурнага жыцця ў рэгіёне; край ў мастацкай літаратуры і г. д. Беларускія літаратуразнаўцы пра рэгіяналізм (А. Бельскі, У. Гніламёдаў, М. Грынчык і інш.).

***2.2 Беларуская літаратура ў яе лакальна-рэгіянальнай спецыфіцы***

2.2.1 Брэстчына літаратурная. Літаратурныя і культурныя традыцыі рэгіёна. Адметнасць вуснай народнай творчасці краю. Легенды, паданні, казкі, запісаныя на тэрыторыі краю і адлюстраванне ў іх гісторыі з'яўлення назваў рэк, азёр і населеных пунктаў. Назвы паселішчаў, звязаных з жыццём і дзейнасцю беларускіх пісьменнікаў. Рамёствы. Адметнасць мовы рэгіёна і яе выкарыстанне ў творах пісьменнікаў.

Рэгіянальная літаратура ў нацыянальным культурна-гістарычным працэсе. Беларускія летапісы пра падзеі і дзеячаў вобласці, раёна, горада, іншага населенага пункта. Літаратура эпохі Адраджэння і родны край. Рэгіянальная літаратура ў складзе Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі. Мясцовыя друкарні. Творы беларускіх пісьменнікаў на беларускай і польскай мовах. Рускія пісьменнікі і Беларусь. Адметнасць рэгіянальнай літаратуры ў пачатку ХХ стагоддзя. Пісьменнікі-землякі ў час Вялікай Айчыннай вайны, іх творы аб родным краі. Рэгіянальная літаратура ў пасляваенны перыяд. Рэгіянальная літаратура на сучасным этапе. Беларускамоўныя і рускамоўныя пісьменнікі-землякі.

Рэгіянальны аспект (прырода, помнікі, мова, людзі і інш.) у творах мастацкай літаратуры. Родныя мясціны як крыніца натхнення для пісьменніка. Прататыпы літаратурных герояў. Родныя, блізкія і знаёмыя пісьменнікаў-землякоў. Іх радаводы.

Рэгіянальныя мадыфікацыі літаратурна-грамадскага жыцця. Стварэнне ў абласных і раённых цэнтрах літаратурных аб'яднанняў і аддзяленняў Саюза пісьменнікаў Беларусі. Выданне альманахаў. Рэгіянальная літаратура ў мясцовым друку. Рэгіянальныя літаратурныя прэміі. Ушанаванне памяці знакамітых пісьменнікаў: помнікі, сядзібы-музеі, кватэры-музеі, хаты-музеі, назвы плошчаў, паркаў, вуліц, наданне імя пісьменніка культурна-асветным установам, установам адукацыі і г.д.

2.2.2 Гродзеншчына літаратурная. Літаратурныя і культурныя традыцыі рэгіёна. Адметнасць вуснай народнай творчасці краю. Легенды, паданні, казкі, запісаныя на тэрыторыі краю і адлюстраванне ў іх гісторыі з'яўлення назваў рэк, азёр і населеных пунктаў. Назвы паселішчаў, звязаных з жыццём і дзейнасцю беларускіх пісьменнікаў. Рамёствы. Адметнасць мовы рэгіёна і яе выкарыстанне ў творах пісьменнікаў.

Рэгіянальная літаратура ў нацыянальным культурна-гістарычным працэсе. Беларускія летапісы пра падзеі і дзеячаў вобласці, раёна, горада, іншага населенага пункта. Літаратура эпохі Адраджэння і родны край. Рэгіянальная літаратура ў складзе Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі. Мясцовыя друкарні. Творы беларускіх пісьменнікаў на беларускай і польскай

мовах. Рускія пісьменнікі і Беларусь. Адметнасць рэгіянальнай літаратуры ў пачатку XX стагоддзя. Пісьменнікі-землякі ў час Вялікай Айчыннай вайны, іх творы аб родным краі. Рэгіянальная літаратура ў пасляваенны перыяд. Рэгіянальная літаратура на сучасным этапе. Беларускамоўныя і рускамоўныя пісьменнікі-землякі.

Рэгіянальны аспект у творах мастацкай літаратуры. Родныя мясціны як крыніца натхнення для пісьменніка. Прататыпы літаратурных герояў. Родныя, блізкія і знаёмыя пісьменнікаў-землякоў. Іх радаводы.

Рэгіянальныя мадыфікацыі літаратурна-грамадскага жыцця. Стварэнне ў абласных і раённых цэнтрах літаратурных аб’яднанняў і аддзяленняў Саюза пісьменнікаў Беларусі. Выданне альманахаў. Рэгіянальная літаратура ў мясцовым друку. Рэгіянальныя літаратурныя прэміі. Ушанаванне памяці знакамітых пісьменнікаў.

2.2.3 Віцебшчына літаратурная. Літаратурныя і культурныя традыцыі рэгіёна. Адметнасць вуснай народнай творчасці краю. Легенды, паданні, казкі, запісаныя на тэрыторыі краю і адлюстраванне ў іх гісторыі з’яўлення назваў рэк, азёр і населеных пунктаў. Назвы паселішчаў, звязаных з жыццём і дзейнасцю беларускіх пісьменнікаў. Рамёствы. Адметнасць мовы рэгіёна і яе выкарыстанне ў творах пісьменнікаў.

Рэгіянальная літаратура ў нацыянальным культурна-гістарычным працэсе. Беларускія летапісы пра падзеі і дзеячаў вобласці, раёна, горада, іншага населенага пункта. Літаратура эпохі Адраджэння і родны край. Рэгіянальная літаратура ў складзе Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі. Мясцовыя друкарні. Творы беларускіх пісьменнікаў на беларускай і польскай мовах. Рускія пісьменнікі і Беларусь. Адметнасць рэгіянальнай літаратуры ў пачатку XX стагоддзя. Пісьменнікі-землякі ў час Вялікай Айчыннай вайны, іх творы аб родным краі. Рэгіянальная літаратура ў пасляваенны перыяд. Рэгіянальная літаратура на сучасным этапе. Беларускамоўныя і рускамоўныя пісьменнікі-землякі.

Рэгіянальны аспект у творах мастацкай літаратуры. Родныя мясціны як крыніца натхнення для пісьменніка. Прататыпы літаратурных герояў. Родныя, блізкія і знаёмыя пісьменнікаў-землякоў. Іх радаводы.

Рэгіянальныя мадыфікацыі літаратурна-грамадскага жыцця. Стварэнне ў абласных і раённых цэнтрах літаратурных аб’яднанняў і аддзяленняў Саюза пісьменнікаў Беларусі. Выданне альманахаў. Рэгіянальная літаратура ў мясцовым друку. Рэгіянальныя літаратурныя прэміі. Ушанаванне памяці знакамітых пісьменнікаў.

2.2.4 Магілёўшчына літаратурная. Літаратурныя і культурныя традыцыі рэгіёна. Адметнасць вуснай народнай творчасці краю. Легенды, паданні, казкі, запісаныя на тэрыторыі краю і адлюстраванне ў іх гісторыі з’яўлення назваў рэк, азёр і населеных пунктаў. Назвы паселішчаў, звязаных з жыццём і дзейнасцю беларускіх пісьменнікаў. Рамёствы. Адметнасць мовы рэгіёна і яе выкарыстанне ў творах пісьменнікаў.

Рэгіянальная літаратура ў нацыянальным культурна-гістарычным працэсе. Беларускія летапісы пра падзеі і дзеячаў вобласці, раёна, горада, іншага населенага пункта. Літаратура эпохі Адраджэння і родны край. Рэгіянальная літаратура ў складзе Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі. Мясцовыя друкарні. Творы беларускіх пісьменнікаў на беларускай і польскай мовах. Рускія пісьменнікі і Беларусь. Адметнасць рэгіянальнай літаратуры ў пачатку ХХ стагоддзя. Пісьменнікі-землякі ў час Вялікай Айчыннай вайны, іх творы аб родным краі. Рэгіянальная літаратура ў пасляваенны перыяд. Рэгіянальная літаратура на сучасным этапе. Беларускамоўныя і рускамоўныя пісьменнікі-землякі.

Рэгіянальны аспект у творах мастацкай літаратуры. Родныя мясціны як крыніца натхнення для пісьменніка. Прататыпы літаратурных герояў. Родныя, блізкія і знаёмыя пісьменнікаў-землякоў. Іх радаводы.

Рэгіянальныя мадыфікацыі літаратурна-грамадскага жыцця. Стварэнне ў абласных і раённых цэнтрах літаратурных аб’яднанняў і аддзяленняў Саюза пісьменнікаў Беларусі. Выданне альманахаў. Рэгіянальная літаратура ў мясцовым друку. Рэгіянальныя літаратурныя прэміі. Ушанаванне памяці знакамітых пісьменнікаў: помнікі, сядзібы-музеі, кватэры-музеі, хаты-музеі, назвы плошчаў, паркаў, вуліц, наданне імя пісьменніка культурна-асветным установам, установам адукацыі і г.д.

2.2.5 Гомельшчына літаратурная. Літаратурныя і культурныя традыцыі рэгіёна. Адметнасць вуснай народнай творчасці краю. Легенды, паданні, казкі, запісаныя на тэрыторыі краю і адлюстраванне ў іх гісторыі з’яўлення назваў рэк, азёр і населеных пунктаў. Назвы паселішчаў, звязаных з жыццём і дзейнасцю беларускіх пісьменнікаў. Рамёствы. Адметнасць мовы рэгіёна і яе выкарыстанне ў творах пісьменнікаў.

Рэгіянальная літаратура ў нацыянальным культурна-гістарычным працэсе. Беларускія летапісы пра падзеі і дзеячаў вобласці, раёна, горада, іншага населенага пункта. Літаратура эпохі Адраджэння і родны край. Рэгіянальная літаратура ў складзе Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі. Мясцовыя друкарні. Творы беларускіх пісьменнікаў на беларускай і польскай мовах. Рускія пісьменнікі і Беларусь. Адметнасць рэгіянальнай літаратуры ў пачатку ХХ стагоддзя. Пісьменнікі-землякі ў час Вялікай Айчыннай вайны, іх творы аб родным краі. Рэгіянальная літаратура ў пасляваенны перыяд. Рэгіянальная літаратура на сучасным этапе. Беларускамоўныя і рускамоўныя пісьменнікі-землякі.

Рэгіянальны аспект у творах мастацкай літаратуры. Родныя мясціны як крыніца натхнення для пісьменніка. Прататыпы літаратурных герояў. Родныя, блізкія і знаёмыя пісьменнікаў-землякоў. Іх радаводы.

Рэгіянальныя мадыфікацыі літаратурна-грамадскага жыцця. Стварэнне ў абласных і раённых цэнтрах літаратурных аб’яднанняў і аддзяленняў Саюза пісьменнікаў Беларусі. Выданне альманахаў. Рэгіянальная літаратура ў

мясцовым друку. Рэгіянальныя літаратурныя прэміі. Ушанаванне памяці знакамітых пісьменнікаў.

2.2.6 Міншчына літаратурная. Літаратурныя і культурныя традыцыі рэгіёна. Адметнасць вуснай народнай творчасці краю. Легенды, паданні, казкі, запісаныя на тэрыторыі краю і адлюстраванне ў іх гісторыі з’яўлення назваў рэк, азёр і населеных пунктаў. Назвы паселішчаў, звязаных з жыццём і дзейнасцю беларускіх пісьменнікаў. Рамёствы. Адметнасць мовы рэгіёна і яе выкарыстанне ў творах пісьменнікаў.

Рэгіянальная літаратура ў нацыянальным культурна-гістарычным працэсе. Беларускія летапісы пра падзеі і дзеячаў вобласці, раёна, горада, іншага населенага пункта. Літаратура эпохі Адраджэння і родны край. Рэгіянальная літаратура ў складзе Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі. Мясцовыя друкарні. Творы беларускіх пісьменнікаў на беларускай і польскай мовах. Рускія пісьменнікі і Беларусь. Адметнасць рэгіянальнай літаратуры ў пачатку ХХ стагоддзя. Пісьменнікі-землякі ў час Вялікай Айчыннай вайны, іх творы аб родным краі. Рэгіянальная літаратура ў пасляваенны перыяд. Рэгіянальная літаратура на сучасным этапе. Беларускамоўныя і рускамоўныя пісьменнікі-землякі.

Рэгіянальны аспект у творах мастацкай літаратуры. Родныя мясціны як крыніца натхнення для пісьменніка. Прататыпы літаратурных герояў. Родныя, блізкія і знаёмыя пісьменнікаў-землякоў. Іх радаводы.

Рэгіянальныя мадыфікацыі літаратурна-грамадскага жыцця. Стварэнне ў абласных і раённых цэнтрах літаратурных аб’яднанняў і аддзяленняў Саюза пісьменнікаў Беларусі. Выданне альманахаў. Рэгіянальная літаратура ў мясцовым друку. Рэгіянальныя літаратурныя прэміі. Ушанаванне памяці знакамітых пісьменнікаў.

2.2.7 Літаратуразнаўчыя сцежкі беларускай сталіцы. Мінск у нацыянальным культурна-гістарычным працэсе. Мясціны, звязаныя з жыццём і творчасцю пісьменнікаў. Літаратурныя назвы вуліц, помнікі і інш. Мінск у творах мастацкай літаратуры.

2.2.8 Літаратурныя мясціны/імёны/творы «малой» радзімы, іх месца і значэнне ў нацыянальным літаратурным працэсе. Літаратурная гісторыя і сучасны літаратурны ландшафт «малой» радзімы, іх месца і значэнне ў нацыянальным літаратурным працэсе. Узаемаадносіны пісьменнікаў-землякоў і роднага краю, услаўленне родных мясцін у творах. Культурныя і літаратурныя адметнасці краю.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ
## (дзённая форма атрымання адукацыі)

| | | Колькасць аўдыторных гадзін | | Самастойная работа студэнта | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя (семінарскія заняткі ) | | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| | **Літаратуразнаўчае краіназнаўства** | **20** | **22** | **54** | | | |
| **1** | **АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ ЛІТАРАТУРАЗНАЎЧАГА КРАІНАЗНАЎСТВА** | **6** | **4** | **20** | | | |
| **1.1** | ***Сутнасць літаратуразнаўчага краіназнаўства*** | ***2*** | | ***4*** | | | |
| 1.1.1 | 1.Краіназнаўства як навука і вучэбны прадмет.<br>2. Паняцці краіназнаўства і беларусазнаўства.<br>3. Комплекснае і галіновае краіназнаўства.<br>4. Літаратуразнаўчае краіназнаўства як галіна агульнага краіназнаўства.<br>5. Краіназнаўчы кампанент пры вывучэнні мастацкай літаратуры. | 1 | | 2 | Мультымедыйная прэзентацыя № 1. Карта Рэспублікі Беларусь | [1-А]<br>[10-Д]<br>[11-Д] | Экспрэс-апытанне |
| 1.1.2 | 1. Суадносіны літаратуразнаўчага краіназнаўства і літаратурнага | 1 | | 2 | Мультымедыйная | [1-А]<br>[6-Д] | Экспрэс-апытанне |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | краязнаўства.<br>2. Напрамкі сучаснага літаратурнага краязнаўства.<br>3. Аб'екты літаратурнага краязнаўства.<br>4. Рэгіянальны кампанент пры вывучэнні літаратуры.<br>5. Гісторыка-культурныя рэгіёны Беларусі. Паняцце «край». | | | | прэзентацыя № 2. Адміністрацыйная карта Рэспублікі Беларусь | [8-Д]<br>[10-Д]<br>[11-Д] | |
| **1.2** | ***Гісторыя станаўлення і развіцця беларусазнаўства, агульнага і літаратурнага краязнаўства ў Беларусі*** | ***4*** | ***2*** | ***8*** | | | |
| 1.2.1 | 1. Вытокі краязнаўства.<br>2. Развіццё беларусазнаўства і краязнаўства ў XIX ст. і пач. XX ст.<br>3. Краязнаўчы рух у 1920-я гг.<br>5. Краязнаўства на сучасным этапе. | 4 | | 4 | Мультымедыйная прэзентацыя № 3 | [1-А]<br>[4-Д]<br>[8-Д]<br>[9-Д] | Тэсціраванне |
| 1.2.2 | Партрэты вучоных-краязнаўцаў: В.Грыцкевіч, М. Ермаловіч, У. Калеснік, І. Казакова, В. Ліцвінка, В. Ляшук, А. Мальдзіс, У. Содаль, А. Фядсоік і інш. | | 2 | | Кнігі, копіі артыкулаў вучоных-краязнаўцаў | [1-А]<br>[9-Д] | Абарона рэфератаў |
| 1.2.3 | 1. Літаратурна-краіназнаўчыя выданні.<br>2. Шматтомныя серыі, асаблівасці выданняў.<br>3. Мастацка-дакументальныя творы пра пісьменнікаў, летапісы жыцця і творчасці беларускіх класікаў, зборнікі пісьменніцкіх аўтабіяграфій.<br>4. Літаратурнае краязнаўства ў беларускіх перыядычных выданнях. | | | 4 | Кнігі серый «Беларусь літаратурная», «Жыццё знакамітых людзей Беларусі» | [11-Д] | Вуснае апытванне |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **1.3.** | ***Літаратурныя музеі як навукова-даследчыя і навукова-метадычныя цэнтры беларусазнаўства і краязнаўства*** | | ***2*** | ***8*** | | | |
| | 1. Значэнне і функцыі літаратурнага музея.<br>2. Агляд дзяржаўных літаратурных музеяў на тэрыторыі сучаснай Беларусі Навукова-даследчая праца супрацоўнікаў. Мінскія і раённыя філіялы музеяў.<br>3. Філіялы, аддзелы, кампазіцыі пры гісторыка-краязнаўчых музеях, прысвечаныя пісьменнікам-землякам.<br>4. Комплексныя музеі. Літаратурныя і літаратурна-краязнаўчыя музеі на грамадскіх пачатках.<br>5. Школьныя музеі. | | 2 | 8 | Мультымедыйная прэзентацыя № 4 | [3-А]<br>[3-Д]<br>[11-Д] | Вуснае апытванне<br>Індывідуальны адказ |
| **2** | **ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІ ТВОР ЯК КРЫНІЦА НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ІНФАРМАЦЫІ** | **14** | **18** | **34** | | | |
| **2.1** | ***Літаратурны рэгіяналізм як неад'емны кампанент нацыянальнай літаратуры*** | ***2*** | | ***4*** | | | |
| | 1. Асновы рэгіянальнага прынцыпу вывучэння літаратуры.<br>2. Беларускія літаратуразнаўцы пра рэгіяналізм. | 2 | | 4 | Копіі артыкулаў літаратуразнаўцаў | [6-Д]<br>[8-Д] | Вуснае апытванне |
| **2.2** | ***Беларуская літаратура ў яе лакальна-рэгіянальнай спецыфіцы*** | ***12*** | ***18*** | ***30*** | | | |
| 2.2.1 | 1. Брэстчына літаратурная. Літаратурныя і культурныя традыцыі | 2 | 2 | 6 | Тэксты мастацкіх твораў | [2-А]<br>[1-Д] | Вуснае апытванне<br>Тэсціраванне |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | рэгіёна.<br>2. Рэгіянальная літаратура ў нацыянальным культурна-гістарычным працэсе.<br>3. Рэгіянальны аспект у творах мастацкай літаратуры.<br>4. Рэгіянальныя мадыфікацыі літаратурна-грамадскага жыцця. | | | | | [2-Д]<br>[6-Д]<br>[7-Д] | |
| 2.2.2 | 1. Гродзеншчына літаратурная. Літаратурныя і культурныя традыцыі рэгіёна.<br>2. Рэгіянальная літаратура ў нацыянальным культурна-гістарычным працэсе.<br>3. Рэгіянальны аспект у творах мастацкай літаратуры.<br>4. Рэгіянальныя мадыфікацыі літаратурна-грамадскага жыцця. | 2 | 2 | 4 | Тэксты мастацкіх твораў | [2-А]<br>[1-Д]<br>[2-Д]<br>[6-Д]<br>[7-Д] | Вуснае апытванне<br>Тэсціраванне |
| 2.2.3 | 1. Віцебшчына літаратурная. Літаратурныя і культурныя традыцыі рэгіёна.<br>2. Рэгіянальная літаратура ў нацыянальным культурна-гістарычным працэсе.<br>3. Рэгіянальны аспект у творах мастацкай літаратуры.<br>4. Рэгіянальныя мадыфікацыі літаратурна-грамадскага жыцця. | 2 | 2 | 4 | Тэксты мастацкіх твораў | [2-А]<br>[1-Д]<br>[2-Д]<br>[6-Д]<br>[7-Д] | Дыскусія<br>Тэсціраванне |
| 2.2.4 | 1. Магілёўшчына літаратурная. Літаратурныя і культурныя традыцыі рэгіёна.<br>2. Рэгіянальная літаратура ў | 2 | 2 | | Тэксты мастацкіх твораў | [2-А]<br>[1-Д]<br>[2-Д]<br>[6-Д] | Вуснае апытванне<br>Тэсціраванне |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | нацыянальным культурна-гістарычным працэсе.<br>3. Рэгіянальны аспект у творах мастацкай літаратуры.<br>4. Рэгіянальныя мадыфікацыі літаратурна-грамадскага жыцця. | | | | | [7-Д] | |
| 2.2.5 | 1. Гомельшчына літаратурная. Літаратурныя і культурныя традыцыі рэгіёна.<br>2. Рэгіянальная літаратура ў нацыянальным культурна-гістарычным працэсе.<br>3. Рэгіянальны аспект у творах мастацкай літаратуры.<br>4. Рэгіянальныя мадыфікацыі літаратурна-грамадскага жыцця. | 2 | 2 | 4 | Тэксты мастацкіх твораў | [2-А]<br>[1-Д]<br>[2-Д]<br>[6-Д]<br>[7-Д] | Вуснае апытванне<br>Тэсціраванне |
| 2.2.6 | 1. Міншчына літаратурная. Літаратурныя і культурныя традыцыі рэгіёна.<br>2. Рэгіянальная літаратура ў нацыянальным культурна-гістарычным працэсе.<br>3. Рэгіянальны аспект у творах мастацкай літаратуры.<br>4. Рэгіянальныя мадыфікацыі літаратурна-грамадскага жыцця. | 2 | 2 | 4 | Тэксты мастацкіх твораў | [2-А]<br>[1-Д]<br>[2-Д]<br>[6-Д]<br>[7-Д] | Вуснае апытванне<br>Індывідуальны адказ |
| 2.2.7 | 1. Літаратуразнаўчыя сцежкі беларускай сталіцы.<br>2. Мінск у нацыянальным культурна-гістарычным працэсе.<br>3. Мясціны, звязаныя з жыццём і творчасцю пісьменнікаў і інш. | | 2 | 4 | Тэксты мастацкіх твораў | [2-А]<br>[1-Д]<br>[2-Д]<br>[6-Д]<br>[7-Д] | Вуснае апытванне<br>Абарона творчай работы |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 4. Мінск у творах мастацкай літаратуры. | | | | | | |
| 2.2.8 | Літаратурныя мясціны/імёны/творы «малой» радзімы, іх месца і значэнне ў нацыянальным літаратурным працэсе. | | 4 | 4 | Карта Рэспублікі Беларусь | [1-А]<br>[1-Д]<br>[2-Д]<br>[6-Д]<br>[7-Д] | Абарона творчай работы |
| | **Усяго гадзін** | **20** | **22** | **54** | | | **Залік** |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная:**

1. Корзюк, А. А. Краеведение Беларуси в вопросах и ответах : пособие / А. А. Корзюк. – Минск : Белорус. гос. пед. ун-т, 2021. – 84 с.
2. Объекты Всемирного наследия ЮНЕСКО в Беларуси : для учащихся учреждений общ. сред. образования / сост. Е. И. Галай. – Минск : Конкурс, 2022. – 48 с.
3. Праскаловіч, В. У. Методыка выкладання беларускай літаратуры. Практыкум : вучэб. – метад. дапам. для студэнтаў вузаў / В. У. Праскаловіч. – 2-е выд. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2023. – 167 с.

**Дадатковая:**

1. Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў : у 2 т. / рэдкал. : У. В. Гніламёдаў [і інш.]. –2-е выд., дапрац. – Мінск : Беларус. навука, 2007–2016. – 2 т.
2. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / рэдкал. : У. В. Гніламёдаў [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 1999–2015. – 4 т.
3. Гужалоўскі, А. А. Музеі Беларусі (1941–1991) / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : Нац. арх. Рэсп. Беларусь, 2004. – 192 с.
4. Дзятко, Д. Яўхім Карскі: бацька навуковага беларусазнаўства / Д. Дзятко. – Мінск : Харвест. 2014. – 100 с.
5. Карлюкевіч, А. Краязнаўчы рэсурс у вывучэнні беларускай літаратуры / А. Карлюкевіч. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2015. – 295 с.
6. Карлюкевіч, А. Праз шкельца гісторыі : нарысы / А. Карлюкевіч. – Мінск : Звязда, 2023. – 238 с.
7. Кулажанка, Л. Літаратурныя мясціны Беларусі : краязнаўчы давед. : дапам. для настаўнікаў : у 3 кн. / Л. Я. Кулажанка, А. І. Мальдзіс, С. Б. Сачанка ; рэд. А. І. Мальдзіс. – Мінск : БелЭн, 2000. – Кн. 1 : Брэсцкая, Віцебская і Гомельская вобласці . – 286 с.
8. Лапцёнак, І. Б. Літаратурнае краязнаўства : вучэб.-метад. матэрыялы / І. Б. Лапцёнак. – Мінск : ІВЦ Мінфіна, 2017. – 43 с.
9. Ляшук, В. Я. Літаратурнае краязнаўства ў школе / В. Я. Ляшук. – Мінск : Выш. школа, 1991. – 150 с.
10. Русак, В. У. Краіназнаўства і краязнаўства : вучэб.-метад. дапам. / В. У. Русак. – Мінск : Беларус. дзярж. тэхн. ун-т, 2011. – 226 с.
11. Тэксталогія і яе дапаможныя навукі : вучэб.-метад. дапам. / В. П. Рагойша [і інш.] ; пад рэд. В. П. Рагойшы. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2015. – 231 с.

## МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ВЫКАНАННІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Рацыянальна арганізаваная і сістэматычная самастойная работа студэнтаў спрыяе авалоданню ведамі, развіццю пазнавальных сіл і творчых здольнасцей, пашырэнню прафесійнага кругагляду, самастойнаму аналізу праблемных пытанняў у галіне прафесійнай дзейнасці.

Для развіцця навыкаў самастойнай работы рэкамендуецца выкарыстанне: пісьмовых і вусных абагульненняў прачытанага матэрыялу; абагульнення назапашанай інфармацыі шляхам складання тэзісаў; сістэматызацыі і класіфікацыі матэрыялу, падрыхтаванага па выніках пошуку, збору і аналізу краязнаўчых крыніц; самастойна падрыхтаваных паведамленняў, мультымедыйных прэзентацый па выніках вывучэння і абагульнення прапанаванага матэрыялу; канспектавання апорных паняццяў і факталагічных звестак.

## ПЕРАЛІК ЗАДАННЯЎ І КАНТРОЛЬНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

| п/п | Назва тэмы | Колькасць гадзін на СРС | Заданні | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 1.1 | Сутнасць літаратуразнаўчага краіназнаўства | 4 | Пазнаёміцца з выданнямі, прапанаванымі ў спісе асноўнай літаратуры па дысцыпліне. | Вусная праверка атрыманых ведаў. |
| 1.2 | Гісторыя станаўлення і развіцця беларусазнаўства, агульнага і літаратурнага краязнаўства ў Беларусі | 8 | Вывучыць неабходныя па тэме гістарычныя факты, падзеі, прозвішчы.<br>Пазнаёміцца на выбар з кнігамі серый «Беларусь літаратурная», «Жыццё знакамітых людзей Беларусі», зборнікамі біяграфій пісьменнікаў «Пяцьдзесят чатыры дарогі», «Пра час і пра сябе», «З росных сцяжын» і інш. | Вусная і пісьмовая праверкі атрыманых ведаў, тэсціраванне. |
| 1.3 | Літаратурныя музеі як навукова-даследчыя і навукова-метадычныя цэнтры беларусазнаўства і краязнаўства | 8 | Наведаць адзін з Дзяржаўных літаратурных музеяў і падрыхтаваць пісьмовую справаздачу адпаведна прапанаванаму плану. | Праверка пісьмовых справаздач, індывідуальная гутарка. |
| 2.1 | Літаратурны рэгіяналізм як неад’емны кампанент нацыянальнай літаратуры | 4 | Прачытаць артыкулы А. Бельскага «Рэгіянальны субстрат і яго роля ў стварэнні нацыянальнага вобраза свету: на матэрыяле беларускай паэзіі» (ч-с «Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта”, серыя 4, 2001, № 1, с. 15–18) і М. Грынчыка «Рэгіянальныя традыцыі ў творчасці Я. Коласа 30-х гадоў» («Беларуская літаратура», вып. 13, Мінск, 1985, с. 57–66), занатаваць тэзісы. | Праверка чытацкіх дзённікаў. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 2.2 | Беларуская літаратура ў яе лакальна-рэгіянальнай спецыфіцы | 30 | Самастойна прачытаць шэраг фальклорных і літаратурных твораў, вывучыць навуковыя крыніцы неабходныя для падрыхтоўкі творчых работ і паведамленняў.<br>Правесці рэкамендаваную выкладчыкам работу па вывучэнню літаратурна-краязнаўчых крыніц ў родных мясцінах. | Вусная праверка атрыманых ведаў.<br><br>Праверка творчых работ. |
| | **Усяго за VII семестр** | **54** | | |

## ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДАВАНЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

У якасці сродкаў дыягностыкі выніковасці навучання па вучэбнай дысцыпліне «Літаратуразнаўчае краіназнаўства» прапануюцца наступныя:

- правядзенне вусных экспрэс-апытанняў па асобных тэмах;
- правядзенне тэсціравання;
- ацэньванне абароны творчых работ;
- індывідуальная гутарка са студэнтам;
- праверка пісьмовых заданняў

Рэкамендаваная формы выніковага кантролю – залік у пісьмовай форме (творчая работа).

## ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ПЫТАННЯЎ ДА ЗАЛІКУ

1. Краіназнаўства як комплекс навуковых дысцыплін і від дзейнасці.
2. Літаратуразнаўчае краіназнаўства як галіна агульнага краіназнаўства.
3. Краіназнаўчы кампанент пры вывучэнні літаратуры.
4. Мэты і задачы літаратурнага краязнаўства.
5. Аб’екты літаратурнага краязнаўства.
6. Напрамкі сучаснага літаратурнага краязнаўства.
7. Значэнне літаратуразнаўчага краіназнаўства і краязнаўства.
8. Фактары ўзнікнення і развіцця беларусазнаўства.
9. Уклад Я. Карскага ў станаўленне беларусазнаўства.
10. Вытокі краязнаўства: погляды і дзейнасць Ф. Скарыны і М. Гусоўскага.
11. Збіральніцкая дзейнасць Радзівілаў, Сапегаў, Храптовічаў, Агінскіх і інш.
12. Краязнаўчыя даследаванні Р. Падбярэскага, А. Рыпінскага, П. Шпілеўскага, А. Кіркора.
13. Беларусазнаўчы аспект творчасці А. Міцкевіча, Я. Чачота, Я. Баршчэўскага, У. Сыракомлі, В. Дуніна-Марцінкевіча, Я. Лучыны, Ф. Багушэвіча.
14. Роля газеты «Наша ніва» (1906–1915) ў развіцці краіна- і краязнаўства.
15. Роля чытанак Цёткі, Я. Коласа, В. Ластоўскага, Я. Лёсіка ў зараджэнні школьнага краязнаўства.
16. Краязнаўчая праца ў 20-я гг. ХХ ст.
17. Роля Інстытута беларускай культуры ў развіцці беларусазнаўства і арганізацыі краязнаўчага руху.
18. Краязнаўства ў 30-я гг. ХХ ст.
19. Развіццё літаратурнага краязнаўства пасля Вялікай Айчыннай вайны.
20. Літаратурнае краязнаўства на сучасным этапе.
21. Асаблівасці сучасных літаратурна-краязнаўчых выданняў.
22. Роля літаратурных музеяў у пашырэнні краязнаўчага фонду.
23. Школьны музей як форма краязнаўчай дзейнасці настаўніка.
24. Рэгіянальны прынцып вывучэння літаратуры. Гісторыка-культурныя рэгіёны Беларусі.
25. Пісьменнікі Брэстчыны ў гісторыі беларускай літаратуры.
26. Пісьменнікі Гродзеншчыны ў гісторыі беларускай літаратуры.
27. Пісьменнікі Віцебшчыны ў гісторыі беларускай літаратуры.
28. Пісьменнікі Магілёўшчыны ў гісторыі беларускай літаратуры.
29. Пісьменнікі Гомельшчыны ў гісторыі беларускай літаратуры.
30. Пісьменнікі Міншчыны ў гісторыі беларускай літаратуры.
31. Рэгіянальны аспект у творах беларускай літаратуры. Аналіз мастацкіх твораў.
32. Вобраз роднага краю ў творах сучасных пісьменнікаў.
33. Літаратурныя і культурныя традыцыі рэгіёнаў Беларусі.
34. Літаратурныя музеі рэгіёнаў Беларусі.
35. Рэгіянальныя мадыфікацыі сучаснага літаратурна-грамадскага жыцця.

# ВІДЫ ТВОРЧЫХ РАБОТ ДЛЯ ЗАЛІКУ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

– Літаратурная карта роднага краю (горада, раёна).
– Літаратурны альбом «малой радзімы» (горада, раёна).
– Віртуальнае падарожжа па родных мясцінах.
– Эсэ «Вобраз «малой радзімы» ў творчасці паэтаў-землякоў».
– Анталогія твораў пісьменнікаў-землякоў.
– Эсэ «Фальклорны родны край (горад, раён)».
– Прэзентацыя «Ушанаванне памяці пісьменнікаў у маіх родных мясцінах».
– Літаратурная храналогія зямляцтва.
– Прэзентацыя «Сучаснае літаратурнае і культурнае жыццё майго раёна (горада)» і інш.

## КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

*10 (дзесяць) балаў, залічана:*

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне, а таксама па асноўных пытаннях, якія выходзяць за яе межы;

дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні;

бездакорнае валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго эфектыўна выкарыстоўваць пры пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

выяўленая здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі;

поўнае і глыбокае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне;

уменне вольна арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку, выкарыстоўваць навуковыя дасягненні іншых дысцыплін;

творчая самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, актыўны творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

*9 (дзевяць) балаў, залічана:*

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго эфектыўна выкарыстоўваць пры пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

поўнае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку;

сістэматычная, актыўная самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

*8 (восем) балаў, залічана:*

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне ў аб'ёме вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны (метадамі комплекснага аналізу, тэхнікай інфармацыйных тэхналогій), уменне яго выкарыстоўваць пры пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

здольнасць самастойна вырашаць складаныя праблемы ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку;

актыўная самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, сістэматычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

*7 (сем) балаў, залічана:*

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць пры пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

вольнае валоданне тыпавымі рашэннямі ў рамках вучэбнай праграмы установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне, засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку;

самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, удзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

*6 (шэсць) балаў, залічана:*

дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне неабходнай навуковай тэрміналогіі, пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць абагульненні і абгрунтаваныя высновы;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць пры вырашэнні вучэбных і прафесійных задач;

здольнасць самастойна выкарыстоўваць тыпавыя рашэнні ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай дысцыпліне і даваць ім параўнальную ацэнку;

актыўная самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, перыядычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

*5 (пяць) балаў, залічана:*

дастатковыя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць высновы;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць пры вырашэнні вучэбных і прафесійных задач;

здольнасць самастойна выкарыстоўваць тыпавыя рашэнні ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім параўнальную ацэнку;

самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, фрагментарны ўдзел у групавых абмеркаваннях, дастатковы ўзровень культуры выканання заданняў.

*4 (чатыры) балы, залічана:*

дастатковы аб'ём ведаў у межах адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі;

засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, лагічны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць высновы без істотных памылак;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць пры вырашэнні стандартных (тыпавых) задач;

уменне пад кіраўніцтвам выкладчыка вырашаць стандартныя (тыпавыя) задачы;

уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім ацэнку;

праца пад кіраўніцтвам выкладчыка на практычных, лабараторных занятках, дапушчальны ўзровень культуры выканання заданняў.

*3 (тры) балы, незалічана:*

недастаткова поўны аб'ём ведаў у рамках адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі;

веданне часткі асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, выклад адказу на пытанні з істотнымі, лагічнымі памылкамі;

слабое валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, некампетэнтнасць пры вырашэнні стандартных (тыпавых) задач;

няўменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне;

пасіўнасць на практычных і лабараторных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў.

*2 (два) балы, незалічана:*

фрагментарныя веды ў рамках адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі;

веды асобных літаратурных крыніц, рэкамендаваных вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

няўменне выкарыстоўваць навуковую тэрміналогію вучэбнай дысцыпліны, наяўнасць у адказе грубых, лагічных памылак;

пасіўнасць на практычных і лабараторных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў.

*1 (адзін) бал, незалічана:*

адсутнасць ведаў (і кампетэнцый) у рамках адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі, адмова ад адказу, адсутнасць на атэстацыі без уважлівай прычыны.

**ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ**
**па вывучаемай дысцыпліне**
**з іншымі дысцыплінамі спецыяльнасці**

| Назва дысцыпліны, вывучэнне якой звязана з дысцыплінай рабочай праграмы | Кафедра, якая забяспечвае вывучэнне гэтай дысцыпліны | Прапановы кафедры аб зменах у змесце рабочай праграмы | Прынятае рашэнне кафедрай, якая распрацавала рабочую праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| «Уводзіны ў літаратуразнаўства» | кафедра беларускай і зарубежнай літаратуры | Пры вывучэнні тэмы «Беларуская літаратура ў яе рэгіянальнай спецыфіцы» больш шырока карыстацца літаратуразнаўчай тэрміналогіяй. | 25.03.2024 г. пратакол № 8 |
| «Літаратуразнаўчы аналіз мастацкага тэксту» | кафедра беларускай і зарубежнай літаратуры | Уключыць у змест праграмы назвы мастацкіх твораў, якія будуць аналізавацца на практычных занятках. | 25.03.2024 г. пратакол № 8 |
| «Вусная народная творчасць» | кафедра беларускай і зарубежнай літаратуры | Пры вывучэнні тэмы «Беларуская літаратура ў яе рэгіянальнай спецыфіцы» карыстацца жанравай тэрміналогія фальклору. | 25.03.2024 г. пратакол № 8 |
| Дысцыпліны модулей «Гісторыя беларускай літаратуры » | кафедра беларускай і зарубежнай літаратуры | Прапаноў няма | 25.03.2024 г. пратакол № 8 |